**Цыганоў, А.** Засада / А. Цыганоў // Віцебскі рабочы. – 1972. – 9 мая. – С. 3.

# ЗАСАДА

Жыхары вёскі Жыльцы скардзіліся, што фашысты з Суражскага гарнізона часта прыязджаюць у вёску і забіраюць жывёлу, збожжа, фураж. І вось наш партызанскі атрад атрымаў заданне адвучыць гітлераўцаў ад рабаўніцкіх налётаў на Жыльцы. Камандаванне прыняло рашэнне наладзіць засаду ля вёскі Парасятніца на ўскраіне лесу і агнём усіх відаў зброі знішчыць іх.

І вось мы размясціліся ў засадзе. Была марозная ноч лютага 1942 года. У твары нам дзьмуў злы вецер. Цяжка было ляжаць у снежных акопах у такую сцюжу, але трэба выканаць загад.

Пачаў займацца золак. Над комінамі вясковых хат узняўся дым. Мы бачым, як жанчыны крочаць па хрусткім снезе па ваду. Вось прабеглі па вуліцы два падлеткі ў кароткіх кажушках. А мароз, здаецца, стаў яшчэ мацнейшым, пачаў скоўваць нашы рукі, ногі.

І вось паявіліся ворагі. Яны ехалі вялікай калонай на падводах. Ратуючыся ад марозу, яны завязалі твары шарфамі і хусткамі, а рукі пахавалі ў кішэнях, рукавах. Фашысты адчувалі сябе тут поўнымі гаспадарамі, бо ў гэтых мясцінах іх яшчэ не трывожылі партызанскія кулі.

– Падрыхтавацца, – падаў каманду камандзір нашага атрада капітан Я. З. Захараў.

Як толькі фашысцкі абоз выехаў на адкрытае месца, ён скамандаваў:

– Агонь!

Загаварылі нашы вінтоўкі, аўтаматы і кулямёты. Я са сваім узводам ударыў па галаўных падводах. Па хвасту білі байцы ўзвода Косці Муніна, а па цэнтры – партызаны Васіля Капытава. Умела і адважна змагаліся тады ўсе народныя мсціўцы. У дваццацімінутным баі нам удалося поўнасцю разграміць фашысцкую калону. На снезе засталося ляжаць 52 трупы варожых салдат і афіцэраў.

Мы сабралі багатыя трафеі – многа зброі і боепрыпасаў. Асобныя гітлераўцы былі апрануты ў тулупы, зробленыя з нарабаваных аўчын, і ў валёнкі, скатаныя з нарабаванай воўны. Мы рашылі зняць іх з грабежнікаў. Калі з аднаго сцягнулі тулуп, то ўбачылі на плячах генеральскія пагоны. І тут здарыўся цуд. «Труп» раптам адкрыў вочы і прамовіў:

– Кальт! Кальт!

Давялося вярнуць генералу тулуп і валёнкі. Пазней мы пераправілі яго ў штаб 4-й Ударнай арміі.

Потым майму ўзводу давялося вытрымаць шалёныя атакі гітлераўцаў, якія імкнуліся адпомсціць нам за знішчэнне калоны грабежнікаў. З дапамогай узвода К. С. Муніна нам удалося адбіць усе атакі і прымусіць карнікаў ратавацца ўцёкамі.

**А. ЦЫГАНОЎ,**

**былы начальнік штаба атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады**